# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

***№ 9 (74) МАЙ 2021***

**Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно”**

***Сёння ў выпуску:***

## БЫЦЬ ДАСТОЙНЫМІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ!






## АПОШНІ ЗВАНОК І ВЫПУСКНЫ БАЛЬ-2021



# 9



# БЫЦЬ ДАСТОЙНЫМІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ!

У рамках **абласной грамадзянска-патрыятычнай акцыі «Быць дастойнымі Вялікай Перамогі!»,** прысвечанай 76-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў нашай установе адукацыі прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы. Старт акцыі быў аб'яўлены на ўрачыстай лінейцы. Вучні ўшанавалі памяць загінулых абаронцаў Радзімы хвілінай маўчання. Вядучыя Я.Морская і А.Кузін асвятлілі трагічныя і гераічныя старонкі гісторыі савецкага народа, якія змагаўся супраць фашызму. У выкананні лепшых чытальнікаў К.Дзярновіч, А.Звоннікавай і Д.Радзевіча прагучалі вершы аб страшнай вайне і вялікай Перамозе.



Вучні 5-6 класаў усклалі кветкі да Брацкай магілы савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму ў гарадскім скверы. Вучні 8 класаў прынялі ўдзел у раённым спартыўным мерапрыемстве ў гонар Перамогі і таксама ўсклалі жывыя кветкі да мемарыяльнага камня на месцы расстрэлу савецкіх грамадзян ля шашы Мінск-Магілёў. Памяць загінулых ушанавалі хвілінай маўчання.



**Школьную віншавальную паштоўку да Дня Перамогі ў рамках абласной акцыі "Быць дастойнымі Вялікай Перамогі" можна ўбачыць праз выкарыстанне QR-кода**

Спецыяльна да святкавання Дня Перамогі ў школе былі наладжаны 2 міні-выставы «Нашы настаўнікі – удзельнікі ВАв» і "Зорачкі на карце Беразіно".

Вучні нашай установы наведалі **ветэранаў вайны С.П.Стасевіч і С.А.Буракова** і павіншавалі іх з Днём Перамогі. Былыя ўдзельнікі вайны падзяліліся з рабятамі сваімі ўспамінамі пра страшны час выпрабаванняў і мужнасці.







# РАЗВІТАЛІСЯ СА ШКОЛАЙ

**Душэўна, цёпла і ўрачыста - вось, бадай, тыя галоўныя словы, якія б ахарактарызавалі б атмасферу майскага свята «Апошні званок» для вучняў 11 класаў** у нашай школе. Сярод ганаровых гасцей мерапрыемства намеснік начальніка Бярэзінскага РАУС па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні, маёр міліцыі Г.М.Рабіза, дырэктар Інтэлектуальнага цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі В.І.Макеенкова, якія павіншавалі рабят з заканчэннем школы і пажадалі ім спакойнага жыцця, пазбаўленай небяспек і перашкодаў.





**Быць шчаслівымі і пасняховымі, і пры гэтым заставацца чалавечнымі** пажадала выпускнікам **дырэктар установы адукацыі С.В.Абрамовіч**. Яна ўзнагародзіла рабят граматамі Бярэзінскага райвыканкама і грашовымі прэміямі. **Сярод узнагароджаных залатая медалістка нашай школы Марына Лапцёнак.**

У гэты святочны дзень прагучала шмат добрых слоў, пажаданняў у адрас віноўнікаў урачыстасці, шчырыя словы падзякі гучалі таксама ў адрас бацькоў, педагогаў, супрацоўнікаў школы. **Павіншавалі выпускнікоў першакласнікі**, якія ў сваю чаргу па традыцыі атрымалі падарункі ад старшакласнікаў.

Выпускнікі, бацькі і класныя кіраўнікі зрабілі ўсё магчымае, каб **свята надоўга запомнілася ўсім яго ўдзельнікам** добрымі і цёплымі словамі вершаў і песень, бліскучымі танцамі, **развітальным школьным вальсам выпускнікоў.**

**Яшчэ больш фота на нашым сайце**





Яркім і запамінальным святам **у чэрвені** стаў **выпускны баль.** Сярод ганаровых гасцей дырэктар дзіцячага Дома творчасці А.І.Драніца і кіраўнік справамі райвыканкама М.П.Бурцаў, які звярнуўся з віншаваннямі да выпускнікоў.

Святлана Віктараўна ўручыла рабятам **заслужаныя ўзнагароды, запаветныя атэстаты, пахвальныя лісты.**

Акрамя таго выпускнікі атрымалі **пасведчанні з прысваеннем разраду «Аператар ЭВМ», «Сталяр».** Двое выпускнікоў, якія наведвалі факультатыўныя заняткі «Уводзіны ў педагагічныя прафесіі», атрымалі **рэкамендацыі для паступлення ў ВНУ на педагагічную спецыяльнасць.**



**Віншаванні дырэктара ўстановы адукацыі С.В.Абрамовіч у адрас выпускнікоў**

**Святочнае мерапрыемства «Апошні званок» прайшло таксама для вучняў 9-х класаў.**

По традыцыі заканчэнне 9-га класа звязваюць з доўгачаканым атрыманнем базавай адукацыі, што дае магчымасць паступаць у сярэднеспецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя ўстановы. Таму для некаторых хлопчыкаў і дзяўчат школьны званок прагучаў у апошні раз.



Аднак, нягледзячы на тое, што многія хлопцы і дзяўчаты працягнуць навучанне ў школе, да падрыхтоўкі і правядзення свята дзевяцікласнікі паставіліся адказна і творча. Яны прадэманстравалі свой талент у розных відах мастацтва: вакальным, інструментальным, танцавальным і тэатральным.







Багата добрых пажаданняў прагучала ў адрас выпускнікоў базавай школы ад імя першай настаўніцы І.У.Шаграй. Яна нагадала вучням, што не трэба спадзявацца толькі на ўдачу, таму што трывалыя веды, старанная вучоба – сапраўдны памочнік на экзамене.

Дырэктар установы С.В.Абрамовіч уручыла лепшым з лепшых Дыпломы Бярэзінскага райвыканкама і грашовыя прэміі за выдатную вучобу і выніковы ўдзел у шматлікіх конкурсах і спаборніцтвах.



**Поспехаў і шчаслівай дарогі вам, выпускнікі!**

# ВЫБРАЦЬ СВОЙ ШЛЯХ

Нягледзячы на завяршэнне навучальнага года, школьнае жыццё працягвае бурліць. Перад старшакласнікамі стаіць **самае галоўнае пытанне – куды пайсці вучыцца.** Спецыяльна для тых вучняў, хто яшчэ да канца не вызначыўся ў выбары будучай прафесіі, праходзяць прафарыентацыйныя мерапрыемствы. Адным з самых яскравых і цікавых такіх мерапрыемстваў стала **сустрэча з педагогамі і навучэнцамі Барысаўскага медыцынскага каледжа.**

Рабятам не толькі расказалі пра асаблівасці навучання ў медыцынскай установе, паказалі рэкламны відэаролік, але і запрасілі на інтэрактыўную пляцоўку. Кожны жадаючы (а іх знайшлося багата!) змог даведацца пра правільны ўход за нованароджаным, зрабіць укол, памерыць ціск, выканаць іншыя медыцынскія працэдуры на муляжах.









У нашай установе для выпускнікоў гарадскіх школ таксама прайшло **прафарыентацыйнае мерапрыемства з удзелам прадстаўнікоў устаноў адукацыі аграрнага профіля**, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, старшыні Бярэзінскага райвыканкама Д.І.Дзішука, кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў раёна.

Старшакласнікі даведаліся пра магчымасці і перспектывы далейшага навучання ў сельскагаспадарчых ВНУ, змаглі атрымаць кансультацыі. Гэтая сустрэча асабліва была цікавая вучням профільных класаў аграрнай накіраванасці нашай школы, якія ўжо даўно вызначыліся з выбарам будучай прафесіі, звязанай з сельскай гаспадаркай, і плануюць пасля атрымання вышэйшай адукацыі вярнуцца на сваю малую радзіму.

# НА ШЛЯХУ ДА ЗАПАВЕТНАЙ МАРЫ

Пасля 9 класа мне паступіла прапанова напісаць заяву ў педагагічны клас. Я без роздумаў гэта зрабіла, бо з дзяцінства марыла стаць настаўніцай пачатковых класаў.



На занятках мы даведваліся шмат новага па псіхалогіі і педагогіцы. Мы прысутнічалі на адкрытых уроках настаўнікаў, а потым самі спрабавалі свае сілы ў ролі настаўніка. Было вельмі цікава назіраць, як цябе ўважліва слухаюць вучні і ўспрымаюць усур’ёз!

Дзякуючы педагагічным пробам, я ўпэўнілася, што сапраўды хачу стаць педагогам, што правільна выбрала спецыялізацыю.

Мне шмат разоў даводзілася чуць, што настаўнік – няўдзячная прафесія. Гэта пужала мяне і насцярожвала. Аднак пасля таго, як я трапіла у БДПУ імя М.Танка на мерапрыемства “Студэнт на адзін дзень”, зразумела, што у мяне шмат аднадумцаў, самых добрых і чуллівых, тых, хто, як і я, хоча звязаць сваё жыццё з педагогікай.

На працягу двух гадоў для мяне лепшым прыкладам для пераймання стала наша настаўніца **Галіна Анатольеўна Наглая,** якой я хачу выказаць **вялікую ўдзячнасць**. Яна шмат зрабіла, каб сфарміраваць нас, падзяліцца сваім настаўніцкім вопытам.

**Усім чытачам нашай газеты, выпускнікам, асабліва тым, хто хоча стаць педагогам, я хачу пажадаць цярпення і веры ў свае сілы. Настойліва працуйце і ў вас усё атрымаецца. Як гаварыў Рычард Бах, “Кожная мара табе даецца разам з сіламі, неабходнымі для яе здзяйснення”.**




**З найлепшымі пажаданнямі настаўнікам і выпускнікам 2021 года ДЗІЯНА ПАПКОВА**

# САМЫЯ АДМЕТНЫЯ ПАДЗЕІ І ФАКТЫ

## 21 СТАГОДДЗЕ: ШКОЛА, НАСТАЎНІК, ВУЧАНЬ, БЕЛАРУСЬ

Пад такой назвай прайшла **школьная педагагічная канферэнцыя**, якая стане памятнай падзеяй для вучняў педагагічных класаў, іх кіраўніка Г.А.Наглай і для ўсіх, хто быў запрошаны на мерапрыемства. Увазе прысутных была прапанавана разнастайная **тэматыка выступленняў: «Добры настаўнік: які ён?», «Мы пра сябе, краіну, школу (вынікі мікрадаследавання)», «Мода для настаўніка», «Савецкая школа: што ўзяць у 21 стагоддзе?», «Трэніруем памяць», «Антыстрэс».** Удзельнікі канферэнцыі выказалі свой асаблівы погляд на праблемы выкладання ў сучаснай школе.

Выступленні вучняў насілі не толькі тэарэтычны, але і практычны характар. Усе прысутныя на канферэнцыі з задавальненнем выконвалі практыкаванні, якія здымаюць стрэс і паляпшаюць псіхалагічны стан.

Мерапрыемства было вельмі цікавым, а яго ўдзельнікі даволі адказна аднесліся да яго правядзення.






## ШКОЛА АКТЫЎНАГА ГРАМАДЗЯНІНА





25 мая для вучняў школы прайшлі мерапрыемствы ў рамках **Школы актыўнага грамадзяніна.** Тэмай для абмеркавання стала **«Сям'я – апора дзяржавы, аплот здзяйсненняў і перамог».** У фокусе – найбольш важныя пытанні: **Міжнародны дзень сям'і**, дзяржава; сацыяльная палітыка, а таксама сямейныя каштоўнасці і традыцыі, роля сям'і ў фарміраванні гарманічнай асобы, сямейнае шчасце, маральныя асновы сям'і. Школьнікі не толькі атрымалі важную інфармацыю, што датычыцца дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, але і з гонарам, цеплынёй распавялі пра сваіх матуль, якія атрымалі **Ордэн Маці**, пра традыцыі сваёй сям'і. У заключэнні мерапрыемства адбылося **выступленне вакальна-інструментальнага калектыва шматдзетнай сям'і Карповічаў,** чые дзеці з'яўляюцца вучнямі нашай школы.




# ЯК ЦІКАВА ПРАВЕСЦІ ЧАС ЛЕТАМ

Рыхтуючы майскі нумар нашай газеты, мы звярнуліся да вучняў 5-8 класаў з просьбай прыдумаць 10 самых яркіх спраў летам.

Некаторыя з апытуемых з цяжкасцю ўяўлялі сабе, чым хочуць заняцца летам. Казалі пра тое, што прыгоды самі знойдуць іх. Аднак жа гаворка ідзе пра **3 месяцы або 92 дні, якія трэба і важна правесці цікава, з карысцю, насычана і, галоўнае, бяспечна.** Аднак, нягледзячы на пастаянныя напаміны настаўнікаў пра неабходнасць беражлівага стаўлення да сябе, свайго жыцця, знайшліся некалькі хлопцаў, якія задумалі знайсці прыгоды на «пятую кропку», пабіцца, наведаць закінутыя будовы. Тут мы ўспомнілі неверагодныя прыгоды Тома Сойера з кнігі Марка Твена, аднак гэты хлопчык – герой кнігі, мы ж гаворым пра рэальнае жыццё, калі неабдуманы ўчынак можа прывесці да бяды.

**У планах большасці рабят** – лес, рэчка. Сапраўды, што можа быць выдатней, чым падыхаць свежым лясным паветрам або ў спякотны дзень атрымаць асалоду ад купання. Але як жа шмат небяспек тоіць у сабе і лес, і рака (тут і ўкус змяі, кляшча, патапленне і г.д.). Можа быць, у нейкую хвіліну школьніку спатрэбіцца дапамога дарослага, якога не апынецца побач. Пра гэта варта помніць.



Таксама вельмі прыемна адзначыць, што хлопцы і дзяўчаты ўключылі ў спіс спраў летам дапамогу бацькам, заробак уласных грошаў, збор ягад і грыбоў, будаўніцтва арэляў для ўсёй вёскі і дзяцей, падарункі мінакам у форме папяровых сэрцаў (паветраных шарыкаў, цукерак), гульні з катом або сабакам, якую трэба навучыць камандам **У спісе важных і адказных спраў на лета** таксама падвучыць рускую мову, вывучыць замежныя словы, прачытаць кнігі. А яшчэ школьнікі запланавалі зрабіць вельмі простыя рэчы, якія бацькі могуць дапамагчы ім ажыццявіць: зладзіць пікнік, навучыць дзіця плаваць, разам купацца і загараць, катацца на роварах, адправіцца ў падарожжа па Бярэзіншчыне, змяніць дызайн пакоя, збудаваць домік на дрэве, пайсці ў паход з начлегам, знайсці новае захапленне і заняцца ім. **Планаў і спраў на лета багата! Няхай яны спраўджваюцца! Галоўнае – памятайце пра бяспеку паводзін!**



**Цудоўнага і бяспечнага летняга адпачынку!**

ДУА “Сярэдняя школа №2 г. Беразіно” 223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба “Юны журналіст”:
Бурая Анастасія, Верас Анастасія, Камароўская Ксенія, Папкова Дзіяна інш.
Кіраўнік клуба А.Я.Ждановіч